“нам не патрэбна”, замест Думы неабходна дабівацца Устаноўчага сходу, які і ўмацуе свабоды, абвешчаныя Маніфестам. Далей гаворыцца, што ўсе землі: казённые, удзельныя, манастырскія, касцёльныя, усе фальваркі і маёнткі, лясы і рэкі павінны перайсці ў рукі ўсяго народа, “да ўсёй нацыі” [5, с. 64–67]. Гэтаму ж была прысвечана і надрукаваная ў кастрычніку 1905 г. пракламацыя “Царова Дума”, у якой БСГ заклікала байкатаваць Думу, прапагандавала ідэю народнага сходу Літвы і Беларусі ў Вільні [3, с. 153].

Асабліва павялічылася выдавецкая справа Грамады пасля заснавання ў канцы 1905 г. уласнай друкарні ў Мінску, якую ўзначаліў Ф.Стэцкевіч, якога спачатку пасылалі ў Галіцыю вывучаць друкарскую справу [6, с.7]. У гэты ж час БСГ выдала ў перакладзе на беларускую мову Маніфест Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў, Галоўнага камітэта Усерасійскага сялянскага саюза, ЦК і АК РСДРП, ЦК ПСР, ЦК ППС з заклікам да фінансавага байкоту антынароднага рэжыму [7, с. 417].

Па няпоўных звестках, нелегальныя выданні БСГ у той час распаўсюджваліся ў гарадах Мінску. Вільні, Дзісне, Рэчыцы, Мінскім, Ігуменскім, Барысаўскім, Бабруйскім, Навагрудскім, Слуцкім паветах Мінскай губерніі, Віленскім, Лідскім, Дзісненскім, Вілейскім, Ашмянскім паветах Віленскай губерніі, Гародзенскім, Берасцейскім, Бельскім паветах Гародзенскай губерніі [7, с. 421]. Слабыя былі сувязі Грамады на ўсходзе Беларусі. Як сведчаць данясенні начальніку Магілёўскага Губернскага ўпраўлення, у Гомельскім, Рагачоўскім, Быхаўскім і Аршанскім паветах у верасні- кастрычніку 1905 г. не было знойдзена ніякіх доказаў дзейнасці БСГ [8]. На тэрыторыі Віцебскай губерніі нейкія, відаць, выпадковыя сувязі былі толькі ў Віцебскім павеце.

Цэнтрам беларускага рэвалюцыйнага і культурнага руху ў канцы 1906 г. – 1907 г. стала Вільня. Сюды пераехалі браты А.І. Луцкевічы і менавіта тут разгарнулася выдавецкая дзейнасць БСГ. Вялікай колькасцю выходзілі беларускія лісткі і брашуры, зборнікі рэвалюцыйных апавяданняў і вершаў. У верасні 1906 г. у Вільні пачала выходзіць першая легальная беларуская газета “Наша доля”, прызначаная для “вясковага і местачковага рабочага люду”. Газета з’яўлялася органам БСГ, выходзіла раз у тыдзень рускімі і лацінскімі літарамі.

**Заключэнне.** Такім чынам, Беларуская сацыялістычная грамада пад час першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. вяла актыўную выдавецкую агітацыйную дзейнасць. У пракламацыях і лістоўках, што выдавала партыя есць водгук на кожную важную падзею рэвалюцыі – Крывавую нядзелю, сялянскія з'езды, Булыгінскую Думу і г.д. У сваіх агітацыйных матэрыялах Грамада выказвала свае адносіны да пытанняў палітычнага ладу краіны, дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, аграрнай палітыкі, барацьбу сялян за зямлю і свае правы.

1. Сідарэвіч, А. Дакументы Беларускай Сацыялістычнай Грамады часоў рэвалюцыі 1905 г. / А. Сідарэвіч // Спадчына. – 1991. – № 3. – С. 39.
2.Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 62. Воп. 1. Спр. 204. Арк. 4–6.
3.Мялешка, М. Барацьба Беларускай Сацыялістычнай Грамады за зямлю ў 1905 г. / М. Мялешка // Полымя. – 1926. – № 1. – С.152–159.
4. Шабуня, К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии / К. И. Шабуня. –Минск, 1962. – 264 с.
5. Ангаретис, З. Белорусская Социалистическая Громада / З. Ангаретис // Вперед. – 1923. – № 2–3. – С.64–67.
6.Стары Пілiп (А. Бурбіс) Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху / Стары Піліп (А. Бурбіс) // Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. – 1921. –№ 1. – С. 7.
7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. – Мінск, 1994. – Ч. 1. – 527 с.
8. НАРБ. – Ф. 60. Воп. 3. Спр.6. Арк. 39–42, 93–94.

## ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАЗВЕДАК 2017 Г. НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ І ПАВІЛЛЯ

*С.С. Юрэцкі*
*Мінск, апарат НАН Беларусі*

На падставе дазвола на права правядзення археалагічных даследаванняў у 2017 г. археалагічныя разведкі праводзіліся аўтарам на тэрыторыі Беларускага Панямоння (Зэльвенскі раён) і Беларускага Павілля ў межах Маладзечанскага, Вілейскага і Астравецкага раёнаў. На момант правядзення палявых работ аўтар з’яўляўся навуковым супрацоўнікам аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”.

Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Зэльвенскага раёна ў 2017 г. адбываліся ў адпаведнасці з ўдзелам у працы школьнага лагера ўстановы адукацыі “Дзяржаўная сярэдняя школа № 3 г.п. Зэльва”.

На тэрыторыі Вілейскага раёна ў археалагічных разведках удзельнічаў старшы навуковы супрацоўнік (на той момант) аддзела археалогіі першабытнага грамадства дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” М.М. Чарняўскі, а на тэрыторыі Астравецкага раёна – загадчык (на той момант) аддзела археалогіі першабытнага грамадства дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” А.М. Мядзведзеў, а таксама прафесар А.І. Мальдзіс.

Мэтай работ перадусім было выяўленне новых помнікаў першабытнай археалогіі, а таксама абследаванне ўжо вядомых паселішчаў. Вынікам праведзеных у 2017 г. работ і прысвечана дадзеная публікацыя.

**Матэрыял і метады.** Асноўным матэрыялам даследавання сталі новыя археалагічныя крыніцы, што былі назапашаны падчас правядзення археалагічных разведак. Таксама папярэдне вывучалася спецыялізаваная літаратура па тэме [1; 3] і архіўная археалагічная дакументацыя, якая захоўваецца ў Цэнтральным навуковым архіве НАН Беларусі (Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі) [2; 4–6].

Даследаванне грунтуецца на коле метадаў, у аснову якіх пакладзены прынцыпы комплекснага падыходу, гістарызму і аб’ектыўнасці. Выкарыстоўваліся фармальна-тыпалагічны, статыстычны, стратыграфічны і гісторыка-параўнальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Мэтай археалагічных разведак 2017 г. на тэрыторыі Зэльвенскага раёна перадусім з’яўляўся пошук матэрыялаў каменнага-бронзавага вякоў на ўзбярэжжах Зэльвенскага вадасховішча.

У выніку археалагічныя разведкі былі праведзены па правабярэжжу р. Зэльвянка ў раёне г.п. Зэльвы. Таксама была абследавана захаваная частка помніка Навасёлкі-2, што быў выяўлены М.М. Чарняўскім у 1968 г. [1, с. 206; 3, Рыс. 1; 4, с. 7–8; 6].

У 2017 г. шляхам паверхневых збораў была абследавана тэрыторыя ад аўтадарогі Н6075 да лініі электраперадач і ўзбярэжжа вадасховішча. У выніку былі выяўлены знаходкі перыяду каменнага-бронзавага вякоў: 3 пласціны (з іх 1 з рэтушшу) і 1 фрагмент пласціны з рэтушшу, 5 адшчэпаў і 3 кавалкі крэменю невызначаных (Мал. 1).

Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Маладзечанскага раёна праходзілі з мэтай пошуку матэрыялаў каменнага-бронзавага вякоў. Была даследавана тэрыторыя правабярэжжа р. Уша ад г. Маладзечна і да в. Заскавічы.

Знаходкі перыяду каменнага-бронзавага вякоў былі выяўлены толькі на помніку Бушавіца-3 падчас шурфоўкі.

Бушавіца-3 (Цюрлеўскі сельскі савет). Помнік выяўлены ўпершыню і размешчаны ў правабярэжжы р. Уша ў 1,5 км на паўднёвы-усход ад помніка Бушавіца-2 [2, с. 1]. Знаходзіцца ў 430 м на захад ад аўтадарогі Маладзечна–Вілейка і ў 130 м на ўсход ад чыгункі. Уяўляе сабой пясчанае ўзвышша вышынёй да 3–4 м і плошчай 60×70 м².

Шурф плошчай 3 м² быў закладзены ва ўсходняй частцы ўзвышша: (GPS: N 54°19′56,65″, E 26°51′33,93″). Стратыграфія: 0–0,15 м – дзёрн і падсцілаючы яго зямельны пакроў; 0,15–0,30 м – цёмна-шэры супесак; 0,30–0,35 м – светлы пясок без знаходак. Знаходкі: крамянёвы адшчэп без рэтушы, фрагмент венца кружальнай керамікі, 5 фрагментаў сценак кружальнай керамікі.

Помнік папярэдне датуецца перыядам каменнага-бронзавага вякоў, а таксама эпохай Ранняга Новага часу.

Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Вілейскага раёна таксама адбываліся з мэтай пошуку матэрыялаў каменнага-бронзавага вякоў. Маршрут разведкі ахапіў тэрыторыю басейна р. Вілія ад в. Асіпавічы і да г. Вілейкі, а таксама па ўзбярэжжах возера Вула каля в. Цынцавічы.

Знаходкі перыяду каменнага-бронзавага вякоў былі выяўлены на помніках у ваколіцах возера Вула каля в. Цынцавічы падчас шурфоўкі.

Вула-3 (Нарачанскі сельскі савет). Помнік знаходзіцца на пясчаным узвышшы ў 2 км на паўночны-захад ад в. Цынцавічы на паўночным узбярэжжы возера Вула (GPS: N 54°33'57.8, E 26°47'32.8"). Выяўлены М.М. Чарняўскім у 2011 г. Даследчыкам у вывараці паваленага дрэва тады былі знойдзены 4 “расчэпленыя крамяні” [5, с. 4]. Помнік месціцца на пясчаным узвышшы вышынёй да 4 м і памерамі 45 м па лініі захад-усход і 65 м па лініі поўнач-поўдзень.



Репозиторий ВГУ

У 2017 г. у цэнтральнай частцы ўзвышша быў закладзены шурф плошчай 1 м² (GPS: N 54°33′57,84″, E 26°47′32,78″). Стратыграфія: дзёрн і падзолісты слой (0–0,20 м); светла-шэры супесак (0,20–0,40 м) і светлы пясок без знаходак (0,40–0,60 м).

Знаходкі: пласціна з рэтушшу, 2 адшчэпа, 4 нявызначаных кавалка крэменю. Помнік папярэдне датуецца перыядам каменнага-бронзавага вякоў (Мал. 2).

Вула-4 (Нарачанскі сельскі савет). Помнік знаходзіцца ў 210 м на поўнач ад помніка Вула-3 (GPS: N 54°34'03.3", E 26°47'43.3"). Выяўлены ўпершыню. Месціцца на пясчаным узвышшы авальнай формы вышынёй 10–15 м і памерамі 100 м па лініі поўнач-поўдзень і 45 м па лініі захад-усход.

У 2017 г. у паўночнай частцы ўзвышша быў закладзены шурф плошчай 1 м² (GPS: N 54°34′3,46″, E 26°47′43,61″). Стратыграфія: дзёрн і падзолісты слой (0–0,15 м); светла-шэры супесак (0,15–0,30 м) і светлы пясок без знаходак (0,30–0,60 м).

Знаходкі: скол з аднапляцовачнага нуклеуса, 6 адшчэпаў, 1 кавалак крэменю нявызначаны. Помнік папярэдне датуецца перыядам каменнага-бронзавага вякоў (Мал. 2).

Вула-5 (Нарачанскі сельскі савет). Помнік знаходзіцца ў 400 м на поўдзень ад помніка Вула-4 (GPS: N 54°33'47.4", E 26°47'22.6"). Выяўлены ўпершыню. Месціцца на пясчаным узвышшы акруглай формы вышынёй 4–5 м і памерамі 110 м па лініі поўнач-поўдзень і 90 м па ліні захад-усход.

У 2017 г. у цэнтральнай частцы ўзвышша быў закладзены шурф плошчай 1 м² (GPS: N 54°33′47,58″, E 26°47′22,81″). Стратыграфія: дзёрн і падзолісты слой (0–0,20 м); светла-шэры супесак (0,20–0,40 м) і белы пясок без знаходак (0,40–0,60 м).

Знаходкі: пласціна з рэтушшу, фрагмент пласціны, 5 адшчэпаў і 5 кавалкаў крэменю нявызначаных. Помнік папярэдне датуецца перыядам каменнага-бронзавага вякоў (Мал. 2).

У адпаведнасці з заданнем, якое было атрымана ад дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", мэтай археалагічнага пошуку на тэрыторыі Астравецкага раёна ў 2017 г. стала праверка інфармацыі наконт выяўлення старажытнасцей перыяду вайны 1812 г. Маршрут разведкі ахапіў тэрыторыю вакол в. Сponды Міхалішчаўскага сельскага савета. Археалагічных знаходак выяўлена не было.

**Заключэнне.** У 2017 г. на тэрыторыі Зэльвенскага раёна была абследавана тэрыторыя правабярэжжа р. Зэльвянка ў ваколіцах г.п. Зэльва, а таксама тэрыторыя помніка Навасёлкі-2.

Археалагічныя работы 2017 г. дазволілі выявіць на тэрыторыі Беларускага Павілля 3 новых помніка з матэрыяламі перыяду каменнага-бронзавага вякоў: Бушавіца-3 (Маладзечанскі раён), а таксама Вула-4 і Вула-5 (Вілейскі раён). Быў абследаваны і вядомы раней у Вілейскім раёне помнік Вула-3.

1. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 344 с.

2. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на поўначы Беларусі ў 1964 г. / М. М. Чарняўскі // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 240.

3. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі / АН БССР, Ін-т гісторыі ; нав. рэд. Д. Я. Цялегін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 142 с.

4. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1980 г. / М. М. Чарняўскі // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 694.

5. Чарняўскі М.М. Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2011 г. / М. М. Чарняўскі // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – ФАНД. Воп. 1.Арх. № 1764. – с. 4.

6. Чернявский, М. М. Отчет об археологических исследованиях в 1968 г. / М. М. Чернявский / М. М. Чарняўскі // Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 325.

## ДЕСТИНАЦИЯ КАК ОСНОВА ФОРМИРОВАНИЯ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКИХ ЭФФЕКТОВ РЕГИОНА

*Е.М. Янкевич*
*Минск, БГЭУ*

В настоящее время особую актуальность приобретает проблема организации отдыха и рекреации населения, когда не рекомендовано посещение других стран в силу закрытых границ. В тоже время дестинация, как место привлекательное для туристов, создает возможности для роста и формирования социально-экономических эффектов, важных для регионального



Репозиторий БГУ